# НАУЧНАЯ ЖИЗНЬ

**Новікаў Сяргей Яўгеньевіч**
кандыдат гістарычных навук,
заг. кафедры гісторыі і сацыяльных навук
Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт
Мінск, Беларусь
siarhnovikau@gmail.com

## XXI МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ "БЕЛАРУСЬ І ГЕРМАНІЯ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ" У МДЛУ

1 красавіка 2022 г. у Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце кафедрай гісторыі, сусветнай культуры і турызму і цэнтрам ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі праведзена XXI міжнародная навуковая канферэнцыя "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць", прысвечаная 77-годдзю Перамогі Савецкага Саюза над нацысцкай Германіяй. У канферэнцыі прынялі ўдзел даследчыкі з розных архіўных, навуковых, навучальных і музейных устаноў Беларусі, Казахстана і Расіі.

З прывітальным словам да ўдзельнікаў канферэнцыі звярнулася сустаршыня аргкамітэта канферэнцыі прарэктар па навуковай рабоце доктар філалагічных навук Л. А. Тарасевіч, якая перадала гасцям і ўсім прысутным даследчыкам сардэчныя прывітанні ад рэктара ўніверсітэта Н. Я. Лапцевай, а таксама пажаданні далейшага захавання дыялогавай пляцоўкі з мэтай фарміравання аб'ектыўных адносін да гістарычнага мінулага, умацавання адзінства беларускага народа ў Год гістарычнай памяці. Ад сябе Л. А. Тарасевіч пажадала поспехаў удзельнікам канферэнцыі і пры гэтым звярнула ўвагу на тое, што новыя ідэі і высновы, да якіх удасца прыйсці ў выніку абмеркавання пастаўленых праблемных і дыскусійных пытанняў, не застануцца толькі ў сферы акадэмічнай навукі, а паўплываюць на вырашэнне надзённых задач у нашым грамадстве, асабліва ў справе ваенна-патрыятычнага выхавання і прафесійнай падрыхтоўкі студэнцкай моладзі.

Праца канферэнцыі ладзілася ў фармаце трох пленарных пасяджэнняў: 1) Беларусь у пачатку Вялікай Айчыннай вайны: дакументальны нарматыў і даследчыцкія падыходы (вядучыя У. К. Коршук і А. М. Літвін); 2) Вялікая Айчынная вайна: людзі – падзеі – факты (вядучыя У. В. Здановіч, С. В. Кулінок); 3) Беларусь і Германія: вякі гісторыі, развіцця і супрацоўніцтва (вядучыя А. М. Кушнярэвіч, І. Р. Углік).

У ходзе першага пасяджэння "Беларусь у пачатку Вялікай Айчыннай вайны: дакументальны нарматыў і даследчыцкія падыходы" былі заслуханы навуковыя даклады гісторыкаў з Расіі і Беларусі: Ю. З. Кантар (Санкт-Пецярбург), Б. М. Кавалёва (Санкт-Пецярбург), І. Д. Папова (Архангельск), А. М. Літвіна (Мінск), С. Я. Новікава (Мінск).

Намеснік дырэктара па знешніх і грамадскіх сувязях Санкт-Пецярбургскага Інстытута гісторыі Расійскай акадэміі навук (РАН) прафесар Ю. З. Кантар выступіла з тэмай "Да дарогі жыцця: шлях ленінградцаў да Ладагі (зіма 1941–1942)", у якой раскрыла малавядомыя старонкі эвакуацыі на самым першым адрэзку, пачынаючы ад гарадской кватэры ленінградцаў да Фінляндскага вакзала, і адтуль да станцыі Барысава Грыва, размешчанай на беразе возера, дзе праходзіла пагрузка на "палутаркі". Даклад падрыхтаваны на малавядомых матэрыялах архіва Упраўлення ФСБ па СПб. і Ленінградскай вобласці, аддзела рукапісаў Расійскай нацыянальнай бібліятэкі. Даследчыца паставіла задачу, што гісторыкам неабходна будзе хоць прыкладна вызначыць агульную лічбу беззваротных страт ленінградцаў у час эвакуацыі – на шляху да Дарогі жыцця, падчас пераправы цераз Ладагу, а таксама ў ходзе іншых, часам вельмі працяглых вандраванняў да месца прызначэння.

Вядучы навуковы супрацоўнік Санкт-Пецярбургскага Інстытута гісторыі РАН прафесар Б. М. Кавалёў агучыў вынікі даследавання добра вядомай для навуковай грамадскасці тэмы "Блакітныя саюзнікі Гітлера: пешшу цераз Беларусь у Расію". Прафесійны ваенны гісторык адзначыў важнасць працягу вывучэння гэтай тэмы па той прычыне, што ў замежнай гістарыяграфіі з'яўляюцца новыя працы, у першую чаргу іспанскіх даследчыкаў, якія выяўляюць новыя аспекты паходу на ўсход Блакітнай іспанскай дывізіі, якая на шляху ў раён Ноўгарада прайшла цераз паўночную тэрыторыю Беларусі. Таму вывучэнне гэтай адметнай для беларускага чытача тэмы мае пэўную перспектыву.

Дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі Паўночнага (Арктычнага) федэральнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава (Архангельск) І. Д. Папоў выступіў з тэмай "Адносіны Баварыі да прыняцца Асноўнага закона ФРГ". Расійскі гісторык раскрыў пазіцыю, якую займалі кіруючыя колы адной з адміністрацыйных адзінак пасляваеннай Германіі – Зямлі Баварыя ў дачыненні да важнай палітычнай акцыі ў ФРГ – прыняцця Асноўнага закона. Як паказаў даследчык, у вырашэнні гэтай складанай задачы былі зацікаўлены розныя сілы, якія намагаліся з улікам сваіх інтарэсаў паўплываць на асобныя палажэнні Канстытуцыі ФРГ.

Загадчык кафедры гісторыі Беларусі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна прафесар У. В. Здановіч прадставіў удзельнікам канферэнцыі вынікі вывучэння тэмы "Баявыя дзеянні летам 1941 г. на тэрыторыі Беларусі: тэрміналагічны аспект". Гісторык прыйшоў да высновы, што адсутнасць адзінага і адназначнага адказу на пытанне аб існаванні ў Савецкім Саюзе напярэдадні вайны абарончага плана не дае падставы прыняць за канчатковы варыянт тэрмін "Абарончая аперацыя на Беларусі 1941 г.", праведзеная ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны войскамі Заходняга фронту на тэрыторыі Беларускай ССР у перыяд з 22 чэрвеня па 9 ліпеня 1941 г.

Загадчык цэнтра ваеннай гісторыі Інстытута гісторыі НАН Беларусі прафесар А. М. Літвін пазнаёміў з вынікамі даследавання тэмы “Да 80-годдзя падзеі: першы правал Мінскага гарадскога падпольнага камітэта (сакавік – красавік 1942 г.)”, якая па цяперашні час прыцягвае ўвагу беларускіх гісторыкаў у сувязі з пэўнай фальсіфікацыяй гэтага пытання ў савецкі час. Адной з прычын такой сітуацыі з’яўлялася абвінавачанне ў супрацоўніцтве і здрадзе асобных удзельнікаў падпольнай барацьбы ў Мінску, якое было вылучана ў першыя пасляваенныя гады ў дачыненні да сапраўдных барацьбітоў за вызваленне беларускай сталіцы ў гады германскай акупацыі.

Загадчык кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта дацэнт С. Я. Новікаў упершыню пазнаёміў навуковую грамадскасць з вынікамі вывучэння тэмы “Генацыд беларускага народа ў нямецкіх трафейных дакументах (на матэрыялах калекцыі НАРБ «Александрыйскія мікрафільмы»)”. Аўтар прыйшоў да высновы, што даследаванне малавядомых дакументальных крыніц, выяўленых сярод матэрыялаў нямецкай трафейнай калекцыі, сведчыць аб значных маштабах вынішчэння мясцовага грамадзянскага насельніцтва, у тым ліку яўрэяў, былых савецкіх ваеннапалонных у ходзе правядзення 54 карных аперацый на тэрыторыі Беларусі ў 1942–1943 гг.

З кароткімі паведамленнямі выступілі: дацэнт кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму С. Р. Лютко (“Аператыўнае абсталяванне тэрыторыі Мінскай вобласці да пачатку Вялікай Айчыннай вайны”); старшы навуковы супрацоўнік цэнтра ваеннай гісторыі Інстытута гісторыі НАН Беларусі Д. Г. Кіенка (“Партызанскія аэрадромы ў Беларусі (1941–1944): каменданты, падрыхтоўка пляцовак і практыка іх выкарыстання”); прафесар кафедры ваеннай стратэгіі факультэта Генштаба Узброеных Сіл УА “Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь” В. І. Шацько, дацэнт кафедры дзяржаўнага і ваеннага кіраўніцтва Генштаба Узброеных Сіл УА “Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь” В. Б. Васілеўскі, слухач кафедры дзяржаўнага і ваеннага кіраўніцтва Генштаба Узброеных Сіл УА “Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь” А. М. Лаўрэнюк (“Праблемы мабілізацыі ў СССР і шляхі іх вырашэння ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны”); загадчык кафедры гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта А. І. Корсак (“Месцы знішчэння (пахавання) цыганскага насельніцтва перыяду германскай акупацыі 1941–1944 гг. на тэрыторыі Беларусі”); дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта БДУ К. І. Козак (“Халакост на тэрыторыі Беларусі: тэрытарыяльныя вайсковыя і цывільныя аспекты і формы вырашэння яўрэйскага пытання ў 1941–1942 гг.”); супрацоўнік навукова-даследчай групы вайсковай гісторыі і археалогіі Беларусі “Рубон” В. Ю. Неліхаў (“Партызанская барацьба ў заходніх абласцях БССР у успамінах В. І. Рыгіна”); загадчык кафедры гісторыі, методыкі выкладання гісторыі і грамадазнаўства Арэнбургскага дзяржаў-

нага педагагічнага ўніверсітэта Р. Р. Хісамутдзінава ("Параненая Беларусь у франтавой паэзіі Юліі Друнінай"); дацэнт кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму А. Г. Цымбал ("Фінансавыя аспекты нацысцкай аграрнай палітыкі ў акупаванай Беларусі (1941–1944) у святле трафейных дакументаў НАРБ").

На другім пленарным пасяджэнні прагучалі даклады К. К. Абдрахманавай (Караганда), У. К. Вазнясенскага (Мінск), С. В. Кулінка (Мінск), А. А. Крыварота (Мінск).

Прафесар кафедры археалогіі, этналогіі і айчыннай гісторыі гістарычнага факультэта Карагандзінскага ўніверсітэта імя Е. А. Букетава К. К. Абдрахманава выступіла з дакладам "Жанчыны Казахстана ў партызанскім руху на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны", у якім на прыкладзе асобных лёсаў удзельніц партызанскай барацьбы ў Беларусі паказала, што жанчыны розных узростаў неслі каласальную ношу ў час вайны, нараўне з мужчынамі ахвяравалі сабой, праяўлялі і мужнасць і сілу духу.

Архівіст 1-й катэгорыі аддзела публікацый НАРБ У. К. Вазнясенскі ўпершыню прадставіў рэзультаты даследавання тэмы "Баі ў асіповіцкіх лясах 14–17 ліпеня 1941 года: першая антыпартызанская аперацыя вермахта на Усходнім фронце", да якіх прыйшоў у выніку вывучэння малавядомых нямецкіх дакументаў, выяўленых у фондах Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, Нацыянальнай архіўнай асацыяцыі ЗША і Федэральнага ваеннага архіва Германіі. На падставе ўнікальных даных аўтар упершыню прыходзіць да высновы аб тым, што менавіта пад Мінскам у ліпені 1941 г. завяршыліся першыя буйнамаштабныя баі, у якіх нямецкае камандаванне ацаніла свайго праціўніка на прыкладзе буйной канцэнтрацыі нерэгулярных фарміраванняў – рассеяных чырвонаармейцаў і партызан. Менавіта ў гэтых баях складваліся прыкметы, характэрныя для наступных антыпартызанскіх аперацый, калі апошнія баі прыгранічнай абароны станавіліся першымі баямі новага партызанскага этапу вайны.

Загадчык аддзела публікацый НАРБ кандыдат гістарычных навук С. В. Кулінок выступіў з дакладам "Нямецкія разведвальна-дыверсійныя вучэбныя цэнтры ў месцах прымусовага ўтрымання грамадзянскага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі (1942–1944)". Даследчык адзначыў, што такімі месцамі на акупаванай тэрыторыі часта з'яўляліся гета, турмы, лагеры ля пярэдняга краю нямецкай абароны, лагеры для грамадзянскага насельніцтва, працоўныя, рабочыя, перасыльныя лагеры, зборныя пункты для адпраўкі мірнага насельніцтва на прымусовыя работы ў Германію.

Вядучы навуковы супрацоўнік цэнтра ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі кандыдат гістарычных навук А. А. Крыварот пазнаёміў удзельнікаў канферэнцыі з вынікамі, якія даследчык атрымаў пры вывучэнні тэмы "Удзел славакаў і чэхаў у падпольным і партызанскім

руху на тэрыторыі Беларусі: праблема даследавання”. Адной з высноў, зробленых аўтарам, з’яўляецца патрэба ў больш шырокім выкарыстанні і звароце да замежных архіўных матэрыялаў, а таксама прац славацкіх і чэшскіх даследчыкаў, што дазволіць атрымаць дадатковыя, у гэтым выпадку незаменныя звесткі аб раскрыцці ролі замежных грамадзян у еўрапейскім супраціўленні на тэрыторыі Беларусі.

У паведамленнях, заслуханых на другім пленарным пасяджэнні, звярталася ўвага на новыя дакументальныя знаходкі, гістарыяграфічныя факты і даследчыцкія ацэнкі, у тым ліку па некаторых старонках гісторыі і асабістых біяграфій людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны. Так, прагучалі паведамленні па наступнай тэматыцы: «Эпітафіі на надмагільных помніках як крыніца ўдакладнення даных аб ахвярах Вялікай Айчыннай вайны» (Д. В. Брыштан), «Віртуальная экскурсія для мультыперспектыўнага вывучэння месца памяці ў Малым Трасцянцы» (А. Я. Далгоўскі), «Пачатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны ў перапісцы кіраўнікоў СССР і Вялікабрытаніі» (І. А. Літвіноўскі, Ю. І. Літвіноўская), «Супрацоўніцтва дзяржаў – удзельнікаў СНД па ўвекавечанні памяці аб Вялікай Айчыннай вайне» (М. В. Стралец, С. А. Пцічкіна).

У ходзе трэцяга пленарнага пасяджэння былі заслуханы наступныя даклады. Прафесар кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму А. М. Кушнярэвіч выступіў на тэму “Роля германскіх уплываў і твораў у развіцці архітэктуры і горадабудаўніцтва Гародні (XII–XVII стст.)”, падкрэсліўшы, што германскія культурныя ўплывы адыгрывалі значную ролю ў развіцці архітэктуры і горадабудаўніцтва Гародні на працягу шматлікіх стагоддзяў, якія і сёння ў многім працягваюць вызначаць мастацкае аблічча і турыстычную прывабнасць Гародні.

Дацэнт кафедры культуралогіі Інстытута сучасных ведаў імя А. М. Шырокава кандыдат гістарычных навук І. Р. Вуглік прапанаваў удзельнікам канферэнцыі тэму “Германскія элементы ў культуры старажытнай Беларусі: аналагі, уплывы”. Аўтар прыйшоў да важнай высновы, што агульныя рысы беларускай і германскай культур абумоўлены старажытнай індаеўрапейскай спадчынай, непасрэднымі кантактамі з варагамі (нарманамі), а таксама апасродкаваным перайменаваннем асобных рыс матэрыяльнай і духоўнай культур.

Вядучы навуковы супрацоўнік цэнтра ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі кандыдат гістарычных навук М. М. Смальянінаў звярнуўся да эгадакументаў цераз тэму “Пісьмы салдат Заходняга фронту як крыніца па вывучэнні маральна-баявога становішча рускай арміі ў 1917 г.”. Даследчык адзначае, што выяўленыя эгадакументы садзейнічаюць найбольш глыбокаму, поўнаму і блізкаму да ісціны вывучэнню маральнага і бытавога становішча расійскіх войск Заходняга фронту, дазваляюць раскрыць “знутры” трансфармацыі настрояў салдат на фронце і паказаць залежнасць ад ваенных падзей унутрыпалітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця ў краіне.

Наместнік дырэктара па ідэалагічнай, выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь дацэнт А. Г. Дашкевіч прадставіла вынікі даследавання па тэме "Баранавіцкі край у гады польска-савецкай вайны (1919–1921)". У якасці высновы прагучала тэза пра тое, што пасля заключэння Рыжскага мірнага дагавора 18 сакавіка 1921 г. тэрыторыя Заходняй Беларусі афіцыйна адышла да Польшчы, а Баранавіцкі край застаўся ў Навагрудскім ваяводстве, на абшарах якога амаль 20 гадоў адкрыта праводзілася каланізатарская і асіміляцыйная палітыка.

Вынікі сваіх даследаванняў прадставілі дацэнт кафедры эканамічных навук МДЛУ І. С. Благуш ("Стратэгічныя рызыкі і магчымасці для індустрыяльнай эканомікі ва ўмовах цэнавага энергетычнага шоку: урокі Германіі"); дацэнт кафедры гісторыі Расіі БДУ В. В. Брыгадзіна ("Нарматыўна-прававыя асновы рэгламентацыі працоўнай дзейнасці савецкага насельніцтва (1920–1930)"); дацэнт кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму МДЛУ І. В. Грабянчук ("Педагагічная адукацыя ў горадзе Бабруйску ў пасляваенны перыяд (1944–1954)"); загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі Магілёўскага дзяржаўнага абласнога інстытута развіцця адукацыі П. А. Канцавы ("Выпрацоўка міжнародна-прававога рашэння па пытанні аб атрыманні рэпарацый з Германіі і яе сатэлітаў у гады Другой сусветнай вайны"); навуковы супрацоўнік цэнтра ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі С. А. Ісакаў ("Узаемаадносіны Ober-Ost і польскага кіраўніцтва ў пытанні эвакуацыі нямецкіх войскаў (студзень – красавік 1919 г.)"); з паведамленнем "Ад Германіі да Эфіопіі: аб працы выпускнікоў і выкладчыкаў МДПІЗМ у якасці ваенных перакладчыкаў (1950–1990)" выступіла старшы навуковы супрацоўнік цэнтра ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі А. У. Кузняцова-Ціманава; дацэнт кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму МДЛУ А. Г. Цымбал пазнаёміў з тэмай "Гісторыя Беларусі XX ст. у адлюстраванні гістарыяграфіі Польскай Народнай Рэспублікі".

У заключнай частцы канферэнцыі былі падведзены яе вынікі. Удзельнікі адзначылі, што адметнай традыцыяй з'яўляецца рэгулярнае выданне зборніка матэрыялаў міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць».

*Поступила в редакцию 27.03.2023*